# БЕЛАРУСКІ ШЛЯХ

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі:
Серпухоуская вул. д. № 12

Рэдакцыя адчынена ад 1 да 2 гадз. пасьля поудня.
Адміністрацыя—зрана ад 10 да 2 гадз. У вечары ад 5 да 7 гадз.
Рэдакцыя пакідае за сабой права папраўляць перасыланые рукапісы і карэспандэнцыі.

Цана асобн. нум. 15 К.

Падпіска: з дастаукай да дому у Мінску на 1 месяц 3 рублі.
Цана абвестак: за верш пэтыту на 1-й стран. 1 руб. на апошняй—50 кап.

Штодзенная грамадзка-палітычная газэта.

№ 28. Менск. Чацьвер 25 красавіка 1918 г. Год I


*Менск 25/IV.*

Калі ні бразгаюць мячы, покуль ні засьціць перад людзьмі сонца а рэха ні нясець з усюль гарматняго грукату, калі мора ні залівае зямлі а вулкан ні засыпае яе попелам і заліваець лаваю, калі людзям ні прыгражае ніякага нібэзпэчэнства,—нацыі жывуць спакойна і у сярэдзіне іх пануе прастасьць інтарэсау жаданнеу, перакананнеу, пачуццяу. Бо у аднагатунковасьці жыцце.

Але у часе агульнаго нішчасьця жыцце меняецца: усе прыймае адзін тон, усе праймаюцца аднэй думкай як супольнымі сіламі выратавацца з бяды.

Навокал сябе мы бачым тамку найлепшыя прыклады: тытаны сусьветнай барацьбы захлушылі у сярэдзіне сябе усе прэчнасьці, каб аддаць усе напруджэння сваіх сілау свайму ваеннаму усьпеху, слабейшыя народы складаюць усе свае сілы разам каб утрымацца на мейсцу, сярод узнятулайся над сьветам буры а іншыя з іх дзеля другой мэты,—каб узнавіць біцце свайго духанаго да гэтых час дзержаунаго арганізму.

Да гэтых апошніх народау належым і мы, беларусы. І павінны ісьці за іх прыкладам і што лепш было-б, даваць свой прыклад.

Сярод нас павінны на гэты грозны час заціхнуць усе спрэчнасьці апроча аднэй,—спрэчнасьці з ворагаміБеларусі,—с тымі Хто працівіцца нашай незалежнасьці. Мы павінны на цяпер забыцца аб усякіх сымпатыях апрача аднэй,—кахання сваей Бацькаушчыны і бажання ей сьветлай будучыны. Толькі гэтым мусім кіравацца у сваіх кроках, якія павінны рабіць ні хістаючыся і рашуча.

## Пытанне на часе.

Разарваная цяпер на тры часьці Беларусь, пасьля вайны стане дужа слабой у сваім гаспадарска-эканамічным жыцці. Асабліва гэта дасца пачуці на весцы, дзе шмат па якіх мейсцах палеткі асталіся без сеўцоў, выгнаных казацкімі нагайкамі ў 1915 г.

А тым часам ні трэба быць прарокам, каб згадаць, што пасьля вайны адно с першых мейсц займе гаспадарка. Але гэта гаспадарка ні будзе ўжо той старой, даўнейшай, кволай —«што пасеяў—то і з'еў», а будзе новай, моцнай, інтэнсыўнай. І толькі дужэйшы у грашах і разумнейшы у спосабах гаспадаркі патрапіць утрымацца на сваім загоне. Цану будуць за зямлю плаціць шалёную і баязно, каб шмат хто з нашых беларусаў ні уздумаў пагандляваць злітаго дзедаўскімі і бацькаўскімі слязьмі і потам загону на панскаё бадзяние па заводах і фабрыках.

Падняцце гаспадаркі і інтэнсыфікацыя яе—вось адно з найглаўнейшых заданняў сучаснаго момэнту. Разважаючы прыклады (Чэхія, Познань), якіх шмат у прошлым, відзімо, што уляпшэнне гаспадаркі ідзе праз арганізацыю вёскі, праз розныя віды коопэрацыі.

Закладанне уселякіх суполак-перш - на-перш гаспадарскіх, дзе селяне маглі-б знайсьці лепшую прыладу дзеля абработкі зямлі, дзе атрымалі-б лепшыя насення, штучныя гноі—без чаго нельга думаці а пляновым паляпшэнні гаспадаркі вёскі—вось патрэба жыцця.

У суполцы селянін знойдзе параду, як загараці свой загон лепей, калі гэта зрабіці, як і куды выгадней прадаці прадукт сваей працы без пасрэднікоў, што абселі яго са ўсіх бакоў,—толькі стуль ён можэ вынясьці для сябе добрую навуку і прыклад, каторыя памогуць яму вырачыся таго зьбітаго адказу, што—жыў дзед ды бацька,—пражыву і я,—так сільна укарэніўшагося у вёсцы; а калі-б удалося вывесьці з вёскі гэны атавістычны погляд якую-б сілу мелі нашы сёлы і мястэчкі злучаныя у коопэрацыі. Бо вёска гэта сіла—а цэлы рад іх—ужо магутная моц.

Селяніну патрэбны грошы—каб выбавіці яго ад балячкі нашай вёскі—ліхвяроў,— чужынцаў, трэба закладаці касы і банчкі—алеж дзеля працы у гэтым напрамку патрэбна арганізацыя, кляновая работа і цэлы кадр працоўнікоў у гэнай справе—справе адбудавання, вёскі, палепшэння яе жыцця і захавання яе ад загляды.

Трэба прызнаці, што сельска-гаспадарскіх суполак на Беларусі надта ні шмат было і да вайны—якая знесла і гэны малы лік. Былі у Гродненшчыне, нават у Віленшчыне, як оазы рэдкія, але пляновай работы у гэным кірунку ні вялося бо у каждай праяве творчасьці і арганізацыі царскі урад відзеў палітыку.

Павэдлуг нас, трэба зараз жэ апрацаваці плян у поднятой тут справі, абдумаці усе тое, што можэ спаткацца пры праводжэнні яго ў жыццё. Трэба стварыці кадр працоўнікаў у гэным напрамку, адкрыўшы курсы для іх адчыніці курсы сельскай гаспадаркі с такой праграмай, якая-б дазваляла трафіці туды селянам і іх дзецям проста ад сахі.— Патрэбны і другія з боляй шырокімі вымаганнямі для слухачоу. І тут зноў трэба зьвярнуцца да практыкі краеў, што зрабілі гэта—узяць стуль лепшае і ні рабіці старых абмылак.

Але работа патрэбна,—бо мо хутка будзе позна...

**Ад. З.**

## АБ НАС.

### С прессы.

Чэнстахоўскі «Dziennik Polski» прыводзячы урывак с прамовы кп. Мацея Радзівілла ў якім гэты польскі дзеяч нагліць палякоў хутчэй будаваць сваю дзержаўнасьць, каб ўзбольшыць для сабе шансы «на ніабходнае для нас расшырэнне на Усходзе» піша: (№ 107 Na marginesie chwili»).

Хто бывау на Беларусі, добра ведае, што гэты вялікі абшар ні мае да гэтаго часу ніякога фундамэнту для самаістнаго дзержаунаго жыцця. Жменька поу-інтылігэнтных агітатарау ні есьць ішчэ народ. Беларусь мусіць падлегчы дзержаунаму і цывілізатарскаму уплыву ці то Польшчы, ці Расіі ці Украіны.

Аб гэтым Варшава думае найменей. І найменей застанауляецца над развіццем польскай палітычнай мыслі, каторая ад Балеславау і Казімірау ішла на усход і адступала з Заходу.

Ну ведама-ж, што ці да Польшчы, ці да Масквы! А можа і да Польшчы, і да Масквы? Як будзе лепі панове рэзакі жываго народу?

Але што датыча «гістарычнаго разьвіцця польскай мысьлі»—гэтых рук распасьцёртых ад «моржа до моржа», то мы стаім перад ніадказанным запытаннем аднаго легіёнеры-беларуса, каторае ён зрабіў на польскім вайсковым мітынгу у Болгарадзе, дзе нейкі «панналкоўнік» гаварыў аб гэтай «польскай мысьлі»: «А ці падумаў пан, пане палкоўніку, што можа часам з рукамі стацца? То-ж можа трафіцца што і рукавоў ні адшукаеш».

«Dążenie na wschód» ні навіна для нас. Ні навіна яно і для украінцаў, каторыя так сама яго добра на сваей скуры адчулі. Вот што піша у звязку з гэтым «донжэнем» украінская кіеўская газэта «Відроджэння» (арт. «Перад фіналом». № 21.)

З цэлаго складу пытанняу якія уходзяць у ігру, найважнейшым для нас—есьць пытанне літоуска - беларускае. З адлучэннем ад Расіі усей этнаграфічнай Беларусі вялікая часьць нашай поуночнай граніцы будзе сасусім абязпечэна, з аднэй толькі перасьцярогаю, калі Беларусь ні будзе далучана да Польшчы, каб Польшча мела супольныя граніцы з Вялікаросіяй. Такое злучэння Польшчы з Вялікаросіяй (праз Беларусь. А. Н.) прыгражало-б ні толькі нашай дзержаве, але і Нямеччыне“.

... «*Толькі пры безпасрэднім звязку Украіны з Беларуссю і Літвой, а праз гэта і з Нямеччынай*, польска-вялікарускі хаўрус ні быў бы вялікай прыгрозай нашай самастойнасьці. Стварэнне такога звязку ёсьць глаўнейшай задачай нашай міжнароднай палітыкі у сучасным мамэнці».

Як бачыце, тутака саўсім другое «dążenie». Мы пачынаем шчыра баяцца за цэласьць польскіх рукавоў...

**А. Н.**

## Агульныя вескі.

КОНСТАНТЫНОПОЛЬ. У ваколіцах Эрывані армянскія банды вырэзалі 5.000 мусульман. Другіе здалелі адкупіцца ад сьмерці толькі за вялікія грошы: у самай Эрывані забіты 100 і ранены 50 мусульман, крамы мусульманскія зрабаваны і мэчет зруйнованы. Шкоды лічаць на 100 мільёнаў рублёў.

БЭРЛІН. Да 1 сакавіка 1918 г. число ўзятых цэнтральнымі дзержавамі палонных даходзіло 3.450.000 душ.

БЭРЛІН (В. Т. Б.) 20.IV. Сягоння скончыўся месяц ад пачатку нашаго наступленьня на заходнім фронці. Ворагі разбіты ў радзі бітваў, утрацілі 171.000 палонных, 1.550 гармат і нялічанае число кулемётаў, ішчэ ні зрахаванае. У нашы рукі папалі больш за 200 панцырных самаходаў. Пасьпешна адступаючы, ворагі пакінулі нам вялізарныя запасы амуніцыі, харчовых прадуктаў і адзежы. Ворагі адкінуты на фронці больш за 100 кіл. шырок. Да 5 красавіка, паводлуг народных вёстак, адны толькі англічане страцілі больш за 50.000 душ. Цяжкія страты былі і у португальцаў. Асабліва цяжкія страты французаў, каторыя шалёнымі контратакамі павінны былі ўсюды выкручывацца с крытычнаго палажэння. Ворагі былі прымушаны вывязьці свае войскі з Італіі і дамагацца нават помачы ад італьянцаў. За адзін месяц ворагі утрацілі ўвесь здабыты ў поўгадавой баталіі на Сомме абшар і дзьве трэціны абшару, здабытага ў крывавай баталіі у Фляндрыі. Апрыч таго, мы здабылі шырокі пояс зямлі, якая дагэтуль

не спазнала страшэнсці гэтай вайны. Найважнейшыя жалезнадарожныя пункты ў паўночнай Францыі: Амьен, Дулян, С.-Поль і Газебрук знаходзяцца пад безупынным нямецкім агнём і ні могуць далей служыць свайму назначэнню.

БЭРН. Каб ашукаць ворагаў, нямецкія лятуны пралятаюць цяпер над фронтам, затрымліваючы машыну. Толькі праляцеўшы некалькі кілёмэтраў за фронт машыны пачынаюць ізноў працаваць.

ЛЮГАНО. Італьянскія газэты ў адзін голас кажуць, што бітва у Фляндрыі прынясе развязку міравой вайны. Мэта немцаў—зьпіштажэнне англіцкай арміі. Пытанне толькі чы англіцкіе войскі і вялізарная падмога з Амэрыкі пасьпеюць у свой час. Барацьба йдзе ні на жыццё, а на сьмерць. Ваенная рада ў Вэрсалі складаецца цяпер с французскага прэдстаўніка генэрала Бэлен—маршалка і членаў: англіцкага генэрала Шэквіль Вэст, італьянскаго—Робіляс і і амэрыканскаго—Бліс.

РОТТЭРДАМ (В.Т.Б.). У англіцкім генэральным штабі с прычыны апошніх нўдач зроблены вялікія перамены. Генэралы Бігэм і Морі зызваны з Англі і атрыма...ь новыя назначэнні на фрон...

ПАРЫЖ. Немцы робяць перагрупіроўку сваіх дывізыяў. Яны сьцягіваюць цяпер цяжкую артылерыю і робяць запас амуніцыі.

Абстрэл Парыжа трывае далей. Адна бомба прабіла страху і два паверхі ў фабрыцы дзе рабілі бронзовыя фігуры.

ПАРЫЖ. Число ахвяр дальнабойнай гарматы даходзіць 354 асоб, у тым ліку 118 забітых. У 1871 г. ў часі 22-дзеннага абстрэлу налічэно 474 ахвяры. у тым ліку 105 забітых.

ПАРЫЖ. С прычыны нівялікіх запасаў мяса кожын месяц адзін тыдзен будзе зусім без мяса. 5 дзён у месяц пазволена ужываць каніну.

ЖЭНЭВА. Социяліст Кошэн на страніцах «Humanité» трэбуе. каб Клемансо аддалі пад суд за тое, што ён быў проці спроб завязаць мірныя перэгаворы.

ВАШЫНГТОН Генэрал Краўдэн у сваім рапарці прапануе мобілізаваць усіх мужчын ад 17 да 50 гадоў.

НЬЮ-ІОРК (Рэўтэр). Ад 15 мая ладзяцца пачтовыя зносіны праз паветрэ між Нью-Іоркам і Вашынгтоном.

БЭРЛІН. (В. Т. Б.) У амэрыканскай арміі узрастае сло прыпадкаў самахвотнаг. калецтва. З забраных амэрыканскіх дакумэнтаў відаць, што у адным батальені за 3 дні было 6 гэткіх прыпадкаў, «неуважлівасьці» пры чыстцы аружжа.

ЛОНДОН (Рэўтэр). Паліцыя забрала учора усе аружжэ і амуніцыю у складах аружжа у Дубліне. Гэтак зроблено і у іншых месцох Ірляндзіі.

ЛОНДОН (Рэўтэр). у Бэльфасьці ірляндзкі нацыяналіст Дэўлін перад тысячамі людзей заявіў, што трэба усімі спосабамі бароцца проці праведзення у жыцце закона аб ваеннай службе

ДУБЛІН (Рэутэр). Супольная конфэрэнцыя ірляндзкіх нацыяналістаў, сін фэйнэраў, работнікаў і духавенства выпусьціла маніфэст проці ваеннай павіннасьці. С-паміж 30 біскупаў надпісаліся на ім 27.

Пробашчы будуць браць ад сваіх парахвіян прысягу працівіцца ваеннай службе. Газэта «Iriche Times», прыхільная да Англіі, моліць урад здаволіцца ірляндзкімі дабравольцамі.

ВАРШАВА. Польская дзяржаўная рада, сазыў каторай быў назначэн на 3 мая, адкрываецца 6.

## Весткі з Украіны.

Кіеўская украінская газэта «Відродження» у № 12 ад 20 красавіка піша аб польскім войску на Украіне:

Польскія войскі глаўным чынам опэруюць у двух раёнах: на Падоллі (Браплаўшчына і сумежныя паветы) і на Кіяўшчыне—у Каняўскім павеце.

Першая група амаль ні ўся складаецца з быўшых воінаў польскіх легіёнаў, якія у складзе аўстрыйскай арміі біліся проціў Расіі. Парушаўшай іх ідэяй было польскае імпэрыялістычнае лятуцэнне: «Польшча ад мора і да мора».

Пасьля заняцця Польшчы немцамі гэтыя легіёны пачалі выступаць проці немцаў, усё ў імя тае-ж ідэі. Каб нідапусьціць анархіі, легіёны былі немцамі абезброяны.

Карыстуючы з бэзладу і адсутнасьці праўдзівай вайсковай сілы на Украіне, гэтыя легіянэры адзінкамі і ў купках пачалі перабірацца на Украіну. Тутака, за дапамогаю месцовых польскіх памешчыкаў, каторыя ніколі ні кідалі гэтаго-ж імпэрыялістычнага лятуцэння, яны згуртаваліся у аддзелы. Як можна бачыць з учынкаў гэтых аддзелаў у Німіраве і іншых мейсцох Браплаўшчыны, яны лічаць сваей задачаю выклікаць у краі анархію, і гэтым перашкаджаць адбудаванню Украінскай дзержавы.

Другая часьць, што опэруе у Каняўскім павеце складаецца з 2-го польскаго корпусу налічаючаго каля 15000 рожных гатункаў зброі. Сфармаваная у згодзе з Украінскім Урадам яна нейкі час ні пакавала свайго варожага адношэння да Украінскай дзержавы. Але скора яна выявіла свае праўдзівае абліччо, агітуючы у народзе, што Украінскі Урад прадаўся немцам, а яны, як праўдзівыя абаронцы працоўнага народу маюць думку ісьці на Кіеў, каб зсадзіць урад і перадаць зямлю селянам. І па праўдзе у скорасьці яны пачалі насувацца па Кіеў. На дарозе да іх прыставало шмат ніпэўнаго элемэнту, спанталычанаго агітацыяй. Пасьля таго як на Кіеў ім было забаронено ісьці, яны зьвярнулі па Каняў маючы на мэці перайсьці на той бок Днепру. Цяпер покуль што яны знайходзяцца у ваколіцах Канява.

Паведамляюць з Жмэрынкі: На станцыі з'ўлілецца шмат польскіх ахвіцэраў і жаўнераў. На запытанне куды яны ідуць, яны адказуюць, што у іх ёсьць прыказання свае й улады, а украінскай яны ні прызнаюць.

КІЕУ. Міністэрство украінскай народнай рэспублікі асыгнавало 50 мільёнаў на дэмобілізацыю Чорнаморскаго флоту.

## Весткі з Расіі.

Ад 5 красавіка ў дадатку да Ленінскаго дэкрэту аб зямлі зрабілася законам у Расіі інша і «Инструкція временныхъ мѣръ», у аграрнай справе. Паміж іншым інструкцыя пазваляе карыстаць у сельскай гаспадарцы працай наёмных работнікаў, што дэкрэтам было забаронено. Інструкцыя аб'яўляе скасаванымі усе социялізатарскія распараджэння, быўшыя да 6 красавіка і конфіскаваную у памешчыкаў зямлю перадае ні земельным камітэтам, а у *прыватнае часовае уладанне аддзельных селян.* Рэкомэндуецца арганізацыя працоўных зямельных камунаў, дзе яны злажацца, землі аддаюцца толькі коммунам. Дворскія жывёла і інвэнтар нацыяналізуюцца і перадаюцца коммунам ці беднейшым з селян. Увесь захоплены перад гэтым селянамі маентакаў інвэнтар мае здбірацца і быць нанова падзеляным па справядлівасьці. Машыны і с.-г. прылады так сама аддаюцца коммунам ці абшчынам. Засевы «працоўных» гаспадарак астаюцца для іх уласьнікаў, памешчыцкія засевы нацыяналізуюцца.

«К. М.»

### Суд Мікалая II.

«Наша Слово» ад 12 г. м. паведамляе:

Найвышшай сьледчай камісіяй, на чале с Крыленко, пастаўлено на чаргу нескольскі судоў над віднейшымі дзеячамі старога парадку. Сэсія адчыняецца судом Мікалая II.

Найвышш. сьлед. камісія дзеліць усе урадаванне Мікалая II на два адцінкі часу: да 17 кастрычніка і пасьля абвяшчэння конституцыі. Злочынства Мікалая у першым пэрыодзі яго царствавання камісія ні разважае, бо ні агранічаны монарха Мікалай II мог рабіць да 1905 г. як яму хацелося і па закону ні падлегае адказу за гэто.

Быўшы імпэратар павінен адказаць толькі за злачынствы пасьля абвешчання конституцыі. Ён абвінавачваецца:

1) У перавароце 3 чэрвня, калі быў зьменяны выбарны закон у Гас. Думу;

1) У ніправідловым расходаванні народных грошы (апанцэрованы бюджэт) і другіх драбнейшых праступках.

Як думаюць члены камісі суд над быўшым царом абецае шмат цікаваго і адкрые цэлы рад злачынстваў дома Раманавых ніведамых нават бліжэйшым да імпэратара асобам.

Мікалай Раманаў будзе дастаўлены у Маскву. Цяпер у Табольск атпраўлены спэцыяльны латышскі аддзел які павінен прывезьці быўшаго імпэратара на суд.

(Кіеў «Посл. Нов.»).

## Афіцыяльнае павядамленне нямецкага вярхоўна[га] камандавання за 24 красавіка 1918 року.

ЗАХАД: На полю бітвы у районе р. р. Ліс і Со[мма] мы ваенная чыннасьць агранічывалася мейсцовымі баямі. П[а]ўночна-заходней Байэль мы заўладалі узвышэннем Вле[й]гельхэк і узялі у палон фруццузаў. Захадней Бэйэля м[ы] адбілі атакі ангельцаў. Моцныя напады ніпрыяцеля поўн.-за[х.] Бэтэна адбіты намі на ліні старажавога ахранення. Баі [на] апошнім фронце далі нам палонных.

Ротмістр барон фон Рыхтгофэн усьцігаўшы працуні[...] над полем бітвы на Сомме ні вярнуўся. Паводлуг ангельска[га] го паведамлення ен загінуў.

УСХОД.

**Фінляндзія:** Войско, якое знаходзіцца пад камандай ге[нэ]рала дэр Гольц заняло жалезнадарожныя вузлы Іівінге Рухімекі і устанавіло зьвязак с фінскай арміяй пауночне[й] Баты.

**Украіна:** У Крыме войско генэрала Коша дайшло Сым[...]фэрополю.

Пэршы-Генэрал-кватэрмэйстар **фон-Людэндорф.**

* * *

Ці задумалась ты, хоць парой,
Струнаў зык што гаворыць табе,
Калі ўмелай іх чэпіш рукой...
Ці задумалась ты, хоць парой?
Зыкам струнаў, як песьняй, спакой
У душу я вяртаю сабе.
Ці падумала ж ты, хоць парой,
Струнаў зык што прыносіць табе?..

Ю. Ф.

## МЕНСКАЕ ЖЫЦЦЕ.

**Рэгістрацыя безработных чыноўнікаў.** Прэдсядацель Губэрнскаго Прысутства Шчэпот'ев паведаміў, каб усе заштатныя служачыя—ад часу большэвіцкаго перавароту—Губэрнскаго Прысутства з'явіліся у чацьвер— 25-го крас. падпісацца на каллектыўным прашэнні да гэрманскаго градоначальніка прыняць іх на даўнейшую службу, або даць ім мейсцы у якім колячы другім ведамстве.

**Грашавыя суммы,** якія паступаюць у Скарбовую палату, або у Казначэйство—паводлуг распараджэння гэрманскай улады—павінны быць усе здадзены у распаражэнне акуп[а]цыйнаго банку, для фінанс[о]ва-эканамічнаго наладжэн[ня] губэрні.

**Маскоўская дэлегацыя** сл[у]жачых Л. Р. ж. д., катора[я] ездзіла у Маскву да народ[]ных камісараў давед вацца а[б] долі служачых, застаўшых[ся] без мейсцау—вярнулася.

Чаго удалося дабіцца ад на[]родных камісараў дэлегацы[і] німа ведама ішчэ, бо пакул[ь] што адбылося толькі ніглас[]нае заседанне членаў упра[ў]лення дарогі.

**Канцылярыя гэрманскаго ва[]еннаго паліцмэйстра** заявіл[а] падаўшым прашэння на слу[]жбу у міліцыю, што на гэты[м] тыдні будзе у газэтах апубл[і]кованы спісак асоб, прыня[]тых на службу.

**Нарада настаўнікаў духоўны[й] сэмінарыі і вучылішча** аб з[]мене іх на хрысьціянскую гімна[]зыю з багаслоўскім інстыту[]там да ніякіх рэзультатаў н[і] дайшла: адны стаяць за то[е] каб зьмяніць толькі саму сь[]стэму і праграму навукі, дру[]гія—каб злучыць у адно—гім[]назыю.

З'езд прэдстаўнікоў духавенства і дзяльных жыхароў усе[й] эпархіі, які маніўся адбыцца [у] маю—покуль ні наладзіц[ца] пераезд аткладаецца на нейк[і] час.

**Гарадзкім арэндатарам**—зно[ў] беда. Земскі стол меськай Уп[]равы наслухаўшыся аб споса[]бах прыйманых прыватнымі уласьнікамі (Ваньковічам, Вол[]каноўскім) і інш проціў арэн[]датараў меських зямель, узяўс[я] за падрахунак нідаімак, што[] назьбіраліся за гэту вайну, а[] пасьля і за узысканне і кары[...]

Арэндатараў упраўска-меськіх землях да 500. Асабліва[] давалася ім у знакі арэнда пры[] заведыванні імі чл. управы п[.] Алевінскаго. Цяпер той жа[] справаў загадуе родны пл[е]меннік п. Алевінскаго п. По[]лоневіч, пераняўшы тые-ж[] спосабы «узбагачэння меськаго скарбу»—высокі чынш пры[] узнаўленні контрактаў (з 5[] кап. 24—48 к. за кв. саж.).

Рэдактар **А. Прушынскі.**

Выдавецтва **Т-во «Заранка».**

Друкарня Я. А. Грэнбіята